ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
3 12 2015 г.

SEX-БАЛЯСЫ

# ЧАС ВЫБРАЎ НАС

**«Не шукайце ідэальнага чалавека. Сёння я дома», — гаварыў у адным фільме герой Адрыяна Чэлентана. Чаго гэта я прыгадаў тую фразу? Калі разабрацца, усе мы на падсвядомым узроўні імкнёмся быць калі не ідэальнымі насамрэч, дык хаця б ствараць бачнасць, што гэта так, у вачах навакольных, не кажучы ўжо пра ўласныя. («Напісаў сваё рэзюме. Раздрукаваў. Перачытаў. Аж расплакаўся... Ну, проста шкада такога чалавека на работу аддаваць!»). Датычыцца гэта і нашых узаемаадносін з супрацьлеглым полам. («Іна пераспала з хлопцам на першым жа спатканні. Каб ён не падумаў, што яна заўсёды такая, ранкам дзяўчына зрабіла строгі твар»). Але, апроч нашых сімпатый, на сітуацыю вельмі часта можа ўплываць час. Так, самы звычайны хуткабежны час і наша стаўленне да яго.**

Што вы падумаеце, калі ваша абранніца будзе пастаянна спазняцца на спатканні? («На жаль, у Зінаіды з дэсантнікам Андрэем нічога не атрымалася, таму што Зінаіда была не фантан»). А калі самі на крылах кахання спяшаецеся на сустрэчу, як цягнецца час? («Калі едзеце ў тралейбусе і спазняецеся, галоўнае — не паказвайце выгляду, што спазняецеся. Тралейбус адчувае ваш страх і едзе яшчэ больш павольна»). Таму, здаецца, будзе цікавым звярнуць увагу на асобныя пункты маштабнага айчыннага даследавання, якое ў краіне было праведзена ўпершыню: суткі беларусаў фактычна апічбавалі і стварылі партрэт выкарыстання часу. На падставе артыкулаў яго расходу можна вызначыць існуючыя гендарныя тэндэнцыі і розніцу ў выкарыстанні часу паміж мужчынамі і жанчынамі. Вам цікава, наколькі ідэальна вы ўпісваецеся ў сярэднестатыстычны партрэт жыхара краіны? З доляй жарту — паехалі!

**Хацелася б абмежавацца анекдотам пра тое, што «планаў на выхадныя яшчэ няма, а жаданні ўжо насцярожваюць», аднак праўда жыцця ў іншым...**

Даследаванне паказала, што беларусы прачынаюцца ў сярэднім у 6 гадзін 37 хвілін. О, у мяне ў «дзявятачку»... («Як настрой?» — «Я ўстаю а шостай раніцы. Які ў мяне можа быць настрой?») Пры гэтым працуючыя жанчыны трацяць на сон 8 гадзін 10 хвілін у суткі, а мужчыны спяць на тры хвіліны больш. («Дзяўчынка была настолькі лянівай, што ўставала на гадзіну раней, каб даўжэй нічога не рабіць»). Жанчыны працуюць у сярэднім 7 гадзін 2 хвіліны, мужчыны — 7 гадзін 47 хвілін. Праўда, апошнія трацяць на 10 хвілін больш, каб дабрацца ад дома на працу ці наадварот. («Дзе ты быў? Абяцаў быць у 8, а ўжо 11?» — «Я ляцеў да цябе куляй!» — «Цябе бачылі ў бары...» — «Рыкашэт!»).


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Даследаванне пацвердзіла, што жанчыны пасля заканчэння працоўнага дня заступаюць на дамашнюю вахту. Усяго 80 працэнтаў свайго вольнага часу яны трацяць на вядзенне хатняй гаспадаркі. («Жанчыны! Памятайце! Вы — не прачкі, не пасудамыйкі, не кухаркі, не прыбіральшчыцы... Вы — анёлы чысціні! Жрыцы парадку! Багіні ўтульнасці! Дом — гэта ваш храм!»). Праўда, было ўстаноўлена, што і 94 працэнты працуючых мужчын хаця б адзін раз на тыдзень выконваюць якую-небудзь работу па доме ці догляд дзяцей. (Вядома, «вам, жанчынам, трэба ад нас толькі адно. Каб мы па дарозе дадому зайшлі ў краму».) Гатаваннем ежы займаецца 95 працэнтаў жанчын супраць 46 працэнтаў мужчын. Дык вядома ж, чаму. «Калі варыць пельмені 20 хвілін, гэта ўсё яшчэ пельмені. Калі 40 хвілін, гэта ўжо макароны па-флоцку, ну, а калі 60 хвілін і пасыпаць іх сырам, дык гэта ўжо лазання».

Вольны час, нагадваюць даследчыкі, па азначэнні прызначаны для культурнага, інтэлектуальнага і фізічнага развіцця і адпачынку. Але з-за ўсіх паўсядзённых клопатаў ён носіць рэшткавы характар. «Учора адключыў інтэрнэт, вырашыў правесці час з сям'ёй. Аказваецца, вельмі прыемныя людзі». На што ідзе час у беларусаў у выхадны дзень? Хацелася б абмежавацца анекдотам пра тое, што «планаў на выхадныя яшчэ няма, а жаданні ўжо насцярожваюць», аднак праўда жыцця ў іншым... «У вас таксама дзень, калі вы мыеце, гатуеце, прыбіраеце, прасуеце, называецца «выхадны»?» Ну, не ўсё так драма. Напрыклад, на спорт і актыўныя віды дзейнасці працуючыя жанчыны затрачваюць у выхадны дзень 19 хвілін супраць 44 у працуючых мужчын. Жанчыны не грэбуюць прагулкамі і паходамі (у сярэднім 12 хвілін), а мужчыны паважаюць рыбалку і паляванне (26 хвілін). («Дарагая, ты дзе была?» — «Бегала!» — «Дзіўна, але ў «Інстаграме» пуста і зусім няма фотаздымкаў!?)». Што датычыцца камп'ютарных гульняў, дык высветлілася, што жанчыны трацяць на іх 10 хвілін, а мужчыны — 30. І я магу патлумачыць, чаму. «Учора вучыў жонку гуляць у «Танкі». Тры гадзіны выбіралі знешнасць і імёны танкістаў». Агульная ж заканамернасць у выкарыстанні вольнага часу працуючымі членамі абследаваных хатніх гаспадарак зводзіцца да таго, што большая яго частка расходуецца пасіўна, пераважна, на прагляд тэлеперадач і фільмаў. «У цябе ў галаве адны серыялы. Я сыходжу!» — Але мы разам ужо пяць сезонаў!»

Вось такі віртуальны дзень сярэдняга беларуса — з ранку і да вечара. «Лагічна было б пайсці спаць раней. Але калі гэта мы паступалі лагічна?». Гэта я наконт стэрэатыпаў, якія датычаць пасіўнага баўлення часу. Ну, вы мяне зразумелі... У сутках час яшчэ ёсць. Ідэальны...

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Я МОЦНА ЗАХАПІЎСЯ ЭКСПЕРЫМЕНТАМІ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

З іншага боку, я імкнуся заўсёды заставацца ў добрых стасунках з музыкантамі, з кім мы ігралі, бо для мяне вельмі важна захаваць чалавечыя адносіны. І многія з тых, з кім мы супрацоўнічалі раней, і цяпер могуць нас у пэўныя моманты выратаваць: дапамагчы на студыі нешта запісаць, замяніць таго, хто раптам захварэў. Мне гэта падабаецца. Толькі двойчы мне даявлося звальняць людзей. А ў астатніх выпадках такія рашэнні былі проста вынікам нашай дамоўленасці, калі разумелі, што так будзе лепш для ўсіх.

**— Быць лідарам такога гурта, як «J:Морс», складана?**

— Непасрэдна менеджментам я сам не займаюся, для гэтага ёсць іншыя людзі. Мая функцыя ў нечым падобная да прадзюсара. Побач са мной працуюць асобы, у іх ёсць свае погляды, патэнцыял і мэты. І, каб атрымаць з усяго гэтага вынік, трэба накіраваць іх у патрэбнае рэчышча. Гэта зрабіць бывае не вельмі проста.

**«Любы артыст, які скажа, што яму не цікавая ўвага гледача, крывадушнік. Інтарэс аўдыторыі — гэта сіла, якая рухае творчасць».**

**— Ці можаце калег, з якімі вы працуеце ў калектыве, назваць сваімі сябрамі?**

— Мы падтрымліваем не толькі прафесійныя стасункі. З часам я прыйшоў да высновы, што калі працуеш з кімсьці, то важна быць з ім на адной хвалі. Павінны быць агульныя інтарэсы, заняткі — тады ўсё атрымаецца. Раней мне здавалася, быццам можна сабраць вакол сябе прафесіяналаў і ўсё складзецца, але ў нас усё па-іншаму.

**— Нядаўна вы далі «таемны канцэрт» пасля выхаду альбома «Паветра», а 13 лютага прыхільнікаў чакае вялікая прэзентацыя. Чым будзеце радаваць?**

— Канцэрт, які вы згадалі, прайшоў у маленькім клубе, без усялякай сцэнаграфіі. А праграма, якую зараз



Фота Валерыя ЛАПЦЭВІЧ.

рыхтуем і пакажам у лютым, якраз будзе непасрэднай прэзентацыяй. Акрамя новых песень, можна будзе пачуць кампазіцыі, што не ўвайшлі ні ў адзін з нашых альбомаў. І, безумоўна, тыя, якія ўжо сталі любімымі. Не абыдзецца і без розных «фішак», але пакуль не раскрыю ўсіх сакрэтаў. Мы пастараемся зрабіць так, каб людзям было цікава і потым было пра што пагаварыць.

**— Тур у падтрымку новага альбома варта чакаць?**

— Ёсць такія думкі, але гэта адбудзецца дакладна пасля прэзентацыі. Наступнай вясной ці восенню — ужо як атрымаецца.

**— Наведваючы з канцэртамі розныя гарады, назіраеце розніцу ў паводзінах публікі?**

— Тое, ці лёгка ўдаецца вывесці гледача на эмоцыі, залежыць ад горада. У некаторых мясцінах рэагуюць вельмі стрымана, а пасля кажуць, што канцэрт быў добрым. А ў іншых здараецца, што ўжо пасля другой песні ўскокваюць. Думаю, паводзіны публікі ў многім залежаць ад нейкага культурнага кода, характэрнага пэўнай мясцовасці, які ў нечым вызначаецца яшчэ і блізкасцю межаў з іншымі краінамі. Хоць у нас і невялікая дзяржава, але рэакцыя аўдыторыі можа быць кардынальна рознай.

**— Ці даўно вы зразумелі, што погляды і ацэнкі іншых на вас не здольны паўплываць?**

— Да такой высновы я прыйшоў, мабыць, гадоў пяць таму. Гаворка пра пэўны этап эвалюцыі публічнага чалавека. Спачатку ты на ўсё рэагуеш, а потым пачынаеш разумець прыроду, механізм такога кшталту ацэнак. І становіцца ясна, што і як, і ў залежнасці ад гэтага ўжо карэкціруеш свае паводзіны, а потым зусім супакойваешся.

**— Што адчувае чалавек, які разумее, што да яго творчасці пачынаюць праяўляць інтарэс іншыя?**

— Са мной гэта здарылася недзе ў 2002 годзе. Спачатку я быў шакіраваны. А потым з'явіўся запал, адрэналін і жаданне рабіць нешта далей. Такія рэчы заўсёды падсцёбваюць творчага чалавека.

**«У мяне назапасіўся патэнцыял, каб рухацца з «J:Морс» далей — гэта быў сігнал нашай гатоўнасці запісваць новы альбом».**


Фота Андрэя ШУМАЕВА.

**— Чым абумоўлены ваш стымул тварыць сёння?**

— З аднаго боку, нічога не знікла. Любы артыст, які скажа, што яму не цікавая ўвага гледача, крывадушнік. Інтарэс аўдыторыі — гэта сіла, якая рухае творчасць. Каб і гледача парадаваць, і зрабіць штосьці новае для сябе. Мы падчас запісу альбома «Паветра» на некаторыя песні зрабілі па некалькі варыянтаў аранжыровак, на што спатрэбілася шмат сіл, часу і выдаткаў. Я вельмі моцна захапіўся эксперыментамі. Але мне цікавы перш за ўсё працэс, як усё адбываецца. А калі песні зроблены і выпушчаны ў свет, то пачынаеш думаць пра зусім іншыя рэчы.

**— Дарэчы, ці дачакаемся мы альбома беларускамоўных палескіх песень, які вы марылі выпусціць?**

— Я вельмі спадзяюся, што гэтая мая задума будзе рэалізаванай. Мне заўсёды было цікава папрацаваць з такога кшталту музычным матэрыялам. Засталося толькі знайсці час і шчыльна засесці за працу...

**Алена ДРАПКО.**

*drapko@zviazda.by*

**(Цалкам інтэрв'ю чытайце на сайце zviazda.by)**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі газеты — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда», грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».

ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.035.

Нумар падпісаны ў 19.30 02.12.2015 г.